- ограниченный доступ к основным рынкам сбыта птицепродукции как зарубежных стран, так и России.

Однако эти трудности не пугают тружеников. Они уверены в конкурентоспособности своей продукции и готовы к работе в условиях вступления России в ВТО.

# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕНЧАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

**Т.М. Капусціч**, *ст. выкладчык*
*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны універсітэт (г. Мінск)*

Сістэма адукацыі любой краіны заклікана садзейнічаць рэалізацыі асноўных задач эканамічнага і культурнага развіцця грамадства, а вышэйшая школа рыхтуе асобу да асноўнай дзейнасці ў галінах эканомікі, культуры, палітыкі. Выкладчык-філолаг ставіць перад сабой мэту не толькі сфарміраваць у студэнтаў арфаграфічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, стылістычныя і іншыя нормы правільнасці маўлення, але і навучыць выкарыстоўваць маўленне ў межах будучай прафесіі.

Выпускнікі ВНУ павінны ўмець адаптавацца ў сучасным грамадстве, самаадукоўвацца, прымяняць уласныя веды і вопыт на практыцы, падбіраць правільныя шляхі вырашэння праблем. Гэтаму спрыяе адзін з распаўсюджаных педагагічных прыёмаў – асобасна-арыентаванае навучанне. Прыём паспяхова рэалізуецца з улікам індывідуальных здольнасцей і вопыту студэнтаў. Асобасна-арыентаваныя тэхналогіі прызнаны сусветнай педагагічнай практыкай як тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення ў працэсе работы з тэкстамі. Індывідуальны падыход заўсёды развівае асобу не толькі спецыяліста, але і звычайнага чалавека, здольнага прымаць абдуманыя і ўзважаныя рашэнні, аналізаваць рознабаковыя сітуацыі, працаваць з інфармацыяй. Прыём арыентуецца на моўную асобу, на авалоданне мовай у дзеянні: функцыянаванне моўных сродкаў у маўленні, моўныя паводзіны ў соцыуме, працэс сучаснай маўленчай камунікацыі.

Адна з ключавых кампетэнцый маладых спецыялістаў — авалоданне вуснай пісьмовай камунікацыяй. Выбар той ці іншай формы адбываецца ў залежнасці ад абставін дзейнасці, але абедзве формы існавання з'яўляюцца функцыянальна разнастайнымі, універсальнымі і абслугоўваюць рознабаковыя сферы грамадства. Нельга дапускаць меркавання: спецыяліст, які працуе ў тэхнічнай сферы, не павінен валодаць культурай маўлення, моўная кампетэнцыя яму без патрэбы. На першым месцы — прафесійная падрыхтаванасць, але здольнасць перадаць свой вопыт, уласныя веды і методыкі – гэта таксама майстэрства, якое з абмежаваным слоўнікавым запасам ажыццявіць складана.

Мэта, якую ставіць перад сабой выкладчык мовы, абавязкова павінна ўключаць наступныя аспекты: узбагачэнне лексічнага запасу студэнтаў, авалодванне спецыяльнай тэрміналогіяй, уменне фармуляваць вуснае і пісьмовае выказванне. Даволі часта даводзіцца чуць ад студэнтаў наступнае: "разумею, але сказаць не магу". Каб зразумець моўныя праблемы студэнтаў, неабходна пастарацца апусціцца да ўзроўню іх моўнай адукаванасці, таму што любое навучанне павінна пачынацца на тым узроўні, на якім знаходзіцца студэнт. Засваенне моўнага матэрыялу – гэта не толькі пазнанне інфармацыі і яе завучванне, а ўменне прымяняць у новых абставінах.

Адна з распаўсюджаных методык узбагачэння лексічнага складу студэнтаў – праца з тэкстамі навуковага, афіцыйна-справавога і публіцыстычнага стыляў (аналіз ужывання моўных сродкаў, пераклад, праяўленне камунікатыўных якасцей і інш.).

З аднаго боку, гэта вывучэнне камунікатыўных якасцей маўлення і ступень іх праяўлення ва ўсіх функцыянальных стылях мовы, а з другога, прымяненне дадзеных патрабаванняў у сваім маўленні. Напрыклад, у афіцыйна-справавым стылі – правільнае, лаканічнае, дакладнае фармуляванне тэксту дакументаў (сінтаксічнае афармленне, выключэнне ўстарэлых выразаў, выкарыстанне сінанімічных паняццяў і інш.), у навуковым тэксце – правільная, лагічная, дарэчная будова разважання на зададзеную тэму (тлумачэнне, доказ, апісанне і інш.), у публіцыстычным варыянце – выразнае, багатае, чыстае выступленне перад аўдыторыяй (віншаванне, данясенне інфармацыі, крытычныя



Рэпазіторый БГАТУ

заўвагі, інструктаж і інш.). Заданні індывідуальнага характару павінны быць разнастайнымі: параўнанне, аналіз, крытыка, аргументаванне, супрацьпастаўленне, падагульненне і т.п.

Адукацыя павінна прапаноўваць выбар сродкаў у працэсе навучання, у фарміраванні моўнай кампетэнцыі асобы. У фарміраванні асобы суразмоўніка неабходна падкрэсліваць эмацыянальны бок, фон, адносіны паміж субяседнікамі ў вусных і пісьмовых дыялогах. Увага, цікавасць і суперажыванне будуюць камунікатыўна-культурныя уменні чалавека.

Асобна спынімся на адным з важных і распаўсюджаных аспектаў выкарыстання мовы – на рабоце над тэкстам дакумента. Тут цесна пераплятаюцца патрабаванні рознага характару: абстрагаванасць і лаканічнасць, прастата і моўна-юрыдычная дакладнасць, сучаснасць і безэмацыянальнасць. З аднаго боку тут паступова і складана выводзяцца з ужывання устарэлыя моўныя выразы, а з другога – надта асцярожна прымяняюцца неалагізмы. Сучасная мова службовых папер беражліва захоўвае канцылярскія штампаваныя выразы, але разам з тым імкнецца да разнастайнасці маўлення. Моўны падыход, выбар сродкаў залежыць ад дакумента, напрыклад, стварэнне тэксту службовага ліста або загаду.

Станоўчы вынік прыносяць разнастайныя моўныя дзеянні, таму што пры рашэнні аднастайных задач асоба на развіваецца.

Моўная падрыхтаванасць — гэта сума атрыманых практычных уменняў і навыкаў, якая абапіраецца на індывідуальны творчы патэнцыял і асабістую ініцыятыву. Культура маўлення маладога спецыяліста адлюстроўвае ўменне правільна і пераканаўча выказвацца, дакладна і чыста мысліць, адэкватна забяспечваць моўнымі сродкамі жыццёвыя прафесійныя сітуацыі. Дадзеныя якасці выпрацоўваюцца наступнымі шляхамі: уменне *ацаніць моўны патэнцыял асобы, уменне пабудаваць самастойнае вуснае і пісьмовае* маўленне, уменне весці дзелавое суразмоўніцтва, уменне надаць тэксту неабходную эмацыянальную афарбоўку, уменне выкарыстоўваць этыкетныя нормы ветлівасціі тактоўнасці, уменне прымяняць невербальныя сродкі і г.д.

Сучаснае грамадства не толькі дае магчымасць, але і патрабуе творчага развіцця патэнцыялу асобы. Асноўная роля тут належыць сям'і, школе і выбранай навучальнай установе. Задача вышэйшай навучальнай установы – падтрымаць і развіць задаткі і здольнасці студэнтаў, у тым ліку і інтарэс да навукова-даследчай дзейнасці.

Пакольні асабісты рэйтынг студэнта складаецца з такіх напрамкаў, як вучэбная, навуковая і грамадская работа, то з першага курса патрэбна выдаць неабходную інфармацыю, зацікавіць асобу, прапанаваць выбар. Сацыялагічныя даследаванні ўказваюць на тое, што большасць студэнтаў-актывістаў праяўляе сябе і ўключаецца ў канкрэтную сферу адразу, з першага семестра.

Для заахвочвання першакурснікаў неабходна матывацыя і канкрэтная рэклама, якая сведчыць аб значных поспехах старэйшых калег. Мэтазгодна правесці навуковы семінар – адкрыты дыялог супрацоўнікаў аддзела па навукова-даследчай рабоце студэнтаў, выкладчыкаў, кіраўнікоў лепшых навуковых студэнцкіх прац, куратараў груп і курсаў, студэнтаў, адказных за навукова-інфармацыйную работу ў групах і інш. Вопыт паказвае, што ў час такой жывой гутаркі адбываецца не проста абмен думкамі, а выяўляюцца асноўныя патрабаванні і перспектывы самастойнай даследчай дзейнасці навучэнцаў, канкрэтызуюцца напрамкі навуковай школы адукацыйнай установы. Для першакурснікаў найважней даць надзею, аказаць падтрымку ў выбары тэматыкі, акрэсліць перспектыву, напрыклад: мэтанакіраваныя публікацыі і даследаванні пад кіраўніцтвам вопытнага выкладчыка з трэцяга курса павінны перарасці ў курсавы праект, а затым вырасці ў паўназначную выніковую дыпломную работу. Такім чынам, перш чым выйсці на міжнародны ўзровень, студэнты спачатку спрабуюць свае сілы на ўнутрыуніверсітэцкіх навуковых канферэнцыях: выпрацоўваюць і пашыраюць тэматыку на кафедральных, факультэцкіх і універсітэцкіх этапах.

Даследчую работу абавязкова патрэбна арганізоўваць паэтапна:

| | |
|---|---|
| падрыхтоўчы (уводны) этап | 1 – 2 курсы |
| развіццевы (асноўны) этап | 3 – 4 курсы |
| даследчы (выніковы) этап | 5 курс |

Падрыхтоўчы этап фарміруе навыкі арганізацыі работы з літаратурнымі крыніцамі, з асноўнымі структурнымі элементамі пісьмовага тэксту. Развіццёвы этап – гэта ўдасканаленне навыкаў непасрэднай даследчай дзейнасці, уменне крытычна мысліць, выяўляць інавацыйныя элементы і разглядаць іх. Выніковы этап – уменне абагуліць сабраны матэрыял і рэальны вопыт, правесці самастойнае даследаванне навукова-практычнай праблемы.

Паміж асобнымі этапамі абавязкова вытрымліваюцца ўмовы пераемнасці і максімальнай самастойнасці. З цягам часу з'яўляецца ўменне не толькі пісьмова і графічна выкладаць думкі, але і дастойна трымацца перад аўдыторыяй, будаваць маналагічнае маўленне, распрацоўваць прэзентацыю, што затым перарастае ў прафесійны імідж.

Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання сведчаць аб слабым узроўні падрыхтаванасці моладзі па культуры маўлення, таму любая дысцыпліна павінна прапаноўваць сістэму, якая павышае культурнае валоданне мовай, развівае моўнае пачуццё.

На падрыхтоўчым этапе актыўна выкарыстоўваюцца такія традыцыйныя віды пісьмовай працы, як рэферат і анатацыя. Рэферат вучыць выбіраць неабходную інфармацыю шляхам крытычнага пераасэнсавання зместу. Анатацыя ўключае галоўныя тэзісы, не канцэнтруе ўвагу на прыкладах, дэталях, цытатах.

Навуковаму кіраўніку варта акцэнтоўваць увагу маладога даследчыка на распаўсюджаных памылках пісьмовых і вусных выступленняў: складаны сінтаксіс, выкарыстанне неасвоеных тэрміналагічных паняццяў, шаблоннасць фармулёвак, фанетычныя недакладнасці і г.д. Камунікатыўна-стылістычны напрамак дзейнасці выпрацоўвае ўменне выказвацца дакладна, лагічна, выбіраць дарэчныя ў моўнай сітуацыі моўныя выразы. Пры магчымасці неабходна прапаноўваць студэнту некалькі варыянтаў ці альтэрнатыўных падыходаў, з якіх ён вымушаны зрабіць адзіна правільны выбар.

Сістэма адукацыі нашай краіны садзейнічае падрыхтоўцы асобы да асноўнай дзейнасці ў эканамічнай, культурнай, грамадска-палітычнай сферах. Сучасны малады спецыяліст павінен камфортна адчуваць сябе ў сацыяльна-эканамічных умовах жыцця, набываць неабходныя веды, выкарыстоўваць іх на практыцы, развіваць уласны інтэлектуальны патэнцыял. Таму задача навучальнай установы – даць магчымасць для творчага развіцця асобы, стварыць спрыяльны асяродак для самавыражэння і самавыяўлення будучага спецыяліста. Партнёрства выкладчыка і студэнта ў навукова-навучальным працэсе павінна быць накіравана на самаразвіццё і самаадукацыю асобы ў працэсе яе адукацыйнага станаўлення, у тым ліку, і ў час вучэбнага культурна-камунікатыўнага дыялога. У працэс камунікацыі абавязкова ўключаюцца рэальныя маўленчыя паводзіны ўдзельнікаў. Камунікатыўная культура грунтуецца на прыкладзе моўных паводзін выкладчыка, на ведах, уменнях і навыках, якія забяспечваюць прафесійна-маўленчую дзейнасць камуніканта.

Перавага сучасных пісьмовых формаў кантролю ведаў вядзе да лексічнага збяднення мовы сучаснай моладзі, што адзначаецца выкладчыкамі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Маўленне перспектыўнага спецыяліста развіваецца і папаўняецца не праз пазнаванне правільнага адказу, у што звычайна ператвараецца распаўсюджаны сёння тэст, а шляхам пабудовы вуснага паведамлення, разважання, доказу, дыскусіі. Моўнае жыццё краіны – гэта канкрэтная сфера прафесійна-асабістых зносін, дзе спецыяліст павінен валодаць моўнымі сродкамі ў аб'ёме, неабходным для выканання ім сваіх службовых абавязкаў.

# ПРИМЕНЕНИЕ ИННОВАЦИОННОЙ ТЕХНОЛОГИИ В ОБУЧЕНИИ СТУДЕНТОВ

**Л.П. Квачук,** *канд. экон. наук, доцент*
*Белорусский государственный аграрный технический университет (г. Минск)*
УДК 378.1 : 001.891

Формирование специалиста, обладающего высоким уровнем профессиональных знаний, способного проявлять инициативу, оперативно и качественно решать производственные задачи, требует радикального совершенствования качества образовательного процесса. Его основой должно стать применение инновационных технологий обучения, в первую очередь модульной технологии обучения.

Подготовка студентов на основе модульной системы позволяет повысить заинтересованность, компетентность обучаемых, обеспечить системно-деятельностный и социально-личностный подход, создающий условия для формирования глубоких знаний, самостоятельной работы студентов и систематического контроля на каждом этапе обучения. Применение модульного обучения повышает активность студентов в получении знаний, стимули-



Репозиторий БГАТУ